ГОД КУЛЬТУРЫ

# У коле сяброў

**У Смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеі 25 лістапада ўспаміналі і ўшаноўвалі землякоў-юбіляраў, што зрабілі значны ўнёсак у культурную спадчыну краю.**

Навуковыя супрацоўнікі апавядалі пра слынных і таленавітых музыкантаў, паэтаў, празаікаў, мастакоў. Сёлетні год багаты на юбілеі творчых людзей. Удзячная памяць землякоў захавала творы і прозвішчы майстроў слова, музыкі і пэндзаля. Пра іх згадвалі на сустрэчы, дзе дэманстраваліся відэа- і фотапрэзентацыі, прысвечаныя творчаму шляху Аляксандра Дзяругі, Віктара Роўды, Аляксандра Шыдлоўскага, Уладзіміра Някляева, Аляксандра Іванова. Салісты раённага Цэнтра культуры выконвалі песні на творы У. Някляева і А. Шыдлоўскага. З прывітальным словам выступіла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Таццяна Ражэва.



**Анатоль БЯЛЯЎСКІ з сястрой Вольгай.**

На імпрэзе прысутнічалі скульптар Уладзімір Церабун, мастак Анатоль Бяляўскі, паэт Ала Клемянок. Кожны з іх прадэманстраваў свае разнастайныя таленты. Уладзімір Церабун выканаў два творы на балалайцы, Ала Клемянок спявала песню, музыку да якой яна напісала на верш паэта-смаргонца Мар'яна Дуксы. Сястра Анатоля Бяляўскага Вольга прачытала свой верш, напісаны да юбілею слыннага брата.

Атмасферу ўзнёсласці і добразычлівасці стварылі музыканты раённага Цэнтра культуры і школы мастацтваў імя М. К. Агінскага.

**Таццяна МАЛЬШЭЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**



**Уладзімір ЦЕРАБУН выканаў два творы на балалайцы.**